# *§ 14–0. Беларусь на шляху да індустрыяльнага грамадства

ПРАМЫСЛОВАСЦЬ
ФАБРЫКА РЭФОРМА
КАПІТАЛІЗМ ВЫТВОРЧАСЦЬ
МАНУФАКТУРА
АКЦЫЯНЕРНАЕ ПРАДПРЫЕМСТВА
СІНДЫКАТ ТРАНСПАРТ ГАНДАЛЬ
РЫНАК

**1. Асаблівасці пераходу ад ручной вытворчасці да машыннай у прамысловасці.** На працягу ўсяго XIX ст., асабліва напрыканцы стагоддзя, адбываецца паступовае павелічэнне ролі прамысловай вытворчасці ў эканамічным жыцці беларускіх губерняў.

Першыя фабрыкі ў Беларусі

Першыя фабрыкі ў Беларусі з'явіліся ў 20-х гг. XIX ст. у мястэчках **Хомск** і **Косава** Гродзенскай губерні. Уладальнікамі былі мясцовыя землеўласнікі. Каля 2/3 фабрык і заводаў Беларусі і прыкладна палова занятых на іх рабочых былі сканцэнтраваныя ў сельскай мясцовасці. Гэта ў значнай ступені было абумоўлена спецыялізацыяй беларускай прамысловасці на перапрацоўцы мясцовай сыравіны і наяўнасцю ў вёсцы таннай рабочай сілы.

Чаму ў Беларусі было выгадна ствараць фабрыкі ў сельскай мясцовасці?

Асаблівасці індустрыяльнага развіцця Беларусі

Пераход ад ручной да машыннай вытворчасці ў Беларусі меў яшчэ адну характэрную адметнасць. У адрозненне ад цэнтральных губерняў Расійскай імперыі, ён адбываўся не ў тэкстыльнай, а перш за ўсё ў харчовай і металургічнай галінах.

Станаўленне прамысловай вытворчасці

Індустрыяльнае развіццё Беларусі на пачатковым этапе вызначалася ў першую чаргу патрэбамі мясцовага рынку і традыцыйнай структурай эканомікі.

Тым не менш, гэта не перашкаджала з’яўленню ўнікальных вытворчасцей. Адна з нямногіх у Расійскай імперыі алоўкавая фабрыка ў Гродне была адзначана ў 1889 г. на сусветнай выставе ў Парыжы. У 1892 г. у Віцебску была адкрытая першая ў Расійскай імперыі фабрыка акуляраў і аптычных прылад. Апроч таго, першы ў заходняй частцы Расійскай імперыі станкабудаўнічы завод пачаў дзейнічаць у 1884 г. у Пінску.




Рэкламны плакат Віцебскай фабрыкі акуляраў і аптычных прылад

*Якую інфармацыю пра фабрыку змяшчае гэты рэкламны плакат?*

У першай палове XIX ст. прамысловы рост у Беларусі адбываўся павольней у параўнанні з іншымі рэгіёнамі Расійскай імперыі. Пераважала дробная рамесніцкая вытворчасць. Большая частка рамесніцкіх майстэрняў у Беларусі была сканцэнтраваная ў гарадах і мястэчках. Значнай была роля рамяства ў металаапрацоўчай, хімічнай, дрэваапрацоўчай галінах.

Рост прамысловай вытворчасці ў канцы XIX — пачатку XX ст.

Працэс развіцця прамысловай вытворчасці ў Беларусі значна паскорыўся ў 80–90-х гг. XIX — пачатку XX ст. У гэты час актыўна развіваліся мануфактуры і фабрыкі. Пачалі работу запалкавыя фабрыкі ў Барысаве і Пінску, тытунёвая ў Гродне, папяровая ў Добрушы.

### Гісторыя і сучаснасць

23 кастрычніка 1901 г. купец Ісідар Берман адкрыў у Барысаве запалкавую фабрыку «Бярэзіна». Тут стаялі паравы кацёл і паравая машына магутнасцю 30 конскіх сіл. У першы год на фабрыцы працавалі 174 чалавекі.

За больш чым стагоддзе сваёй гісторыі запалкавая фабрыка прайшла некалькі мадэрнізацый, быў значна пашыраны асартымент выраблены прадукцыі. У 1998 г. фабрыка была пераўтворана ў ААТ «Барысаўдрэў». На цяперашні час яно з'яўляецца адным з найбуйнейшых прадпрыемстваў дрэваапрацоўчай прамысловасці ў Рэспубліцы Беларусь.




*Этыкетка прадукцыі запалкавай фабрыкі «Бярэзіна»*

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якія яшчэ прадпрыемствы, заснаваныя ў XIX — пачатку XX ст., працягваюць работу і ў наш час.*
2. *Якія змены адбыліся на іх за час дзейнасці?*

Прамысловы ўздым напачатку XX ст.

Ад 1909 г. у эканамічным развіцці Беларусі назіраўся новы прамысловы ўздым, які працягваўся да пачатку Першай сусветнай вайны. Тэмпы развіцця прамысловасці Беларусі ў гэты час былі вышэйшыя, чым сярэднія паказчыкі па Расійскай імперыі, — сярэднегадавы прырост прамысловай вытворчасці склаў 13,9 %. Апераджальнымі тэмпамі развівалася фабрычна-заводская прамысловасць.

**Завяршэнне прамысловага перавароту**

На пачатак XX ст. прамысловы пераварот у Беларусі завяршыўся, але працягвалася далейшае тэхнічнае пераўзбраенне фабрычна-заводскай вытворчасці. Ва ўсіх галінах прамысловасці Беларусі адбыўся рост энергаўзброенасці дзякуючы выкарыстанню паравых і электрычных машын, рухавікоў унутранага згарання.

Аднак на тэрыторыі Беларусі па-ранейшаму захоўвалася высокая доля дробнай вытворчасці. Напачатку XX ст. у Беларусі на душу насельніцтва прыходзілася амаль у два разы менш выраблена й прамысловай прадукцыі, чым у сярэднім па Расійскай імперыі. Але 12 % запалкавай вытворчасці Расійскай імперыі належала беларускім прадпрыемствам, на долю мясцовых вытворчасцей прыходзілася 18 % прадукцыі лесахімічнай прамысловасці Расійскай імперыі. У Добрушы і Шклове дзейнічалі буйны́я папяровыя фабрыкі, была распачата фабрычная вытворчасць шпалераў у Мінску.

**Дынаміка індустрыялізацыі**

**2. Развіццё капіталістычных адносін.** Уплыў індустрыялізацыі на развіццё капіталістычных адносін у розных краінах і рэгіёнах быў неаднолькавы. У беларускіх губернях Расійскай імперыі гэты працэс прыпазніўся і не атрымаў належнага развіцця. Пра дынаміку індустрыялізацыі мяркуюць па паказчыку, які фіксуе адносную колькасць рабочай сілы, задзейнічанай у сельскагаспадарчай вытворчасці. Напрыканцы XIX ст. 76,3 % насельніцтва Беларусі было занята ў гэтай галіне эканомікі.

**Роля дзяржавы ў эканоміцы**

Для Расійскай імперыі была ўласцівая выключная роля дзяржавы ў ініцыяванні, вызначэнні кірунку працэсаў эканамічнага развіцця. Аднак на тэрыторыі беларускіх губерняў дзяржава выконвала ролю стрымальніка.

**Нераўнамернасць у развіцці капіталістычных адносін**

Нераўнамернасць у разгортванні капіталістычных адносін праявілася ў рэгіянальных адметнасцях: заходняя частка Беларусі паводле многіх паказчыкаў аказалася больш уцягнута ў працэсы станаўлення ін-

дустрыяльнага грамадства. У адрозненне ад многіх іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі, у беларускіх губернях менш значную ролю ў развіцці капіталістычных адносін адыгрывалі гарады. У Беларусі большасць прамысловых прадпрыемстваў размяшчалася ў сельскай мясцовасці, бóльшая іх частка належала мясцоваму дваранству.

**3. Манапалістычны капіталізм на Беларусі.** У гады прамысловага ўздыму напачатку XX ст. павялічылася доля акцыянернага капіталу (капіталу акцыянернага таварыства, што размяркоўваецца шляхам выпуску акцый і аблігацый).

**Стварэнне акцыянерных прадпрыемстваў**

Успомніце, што такое манаполія. Якія віды манапалістычных аб'яднанняў вы ведаеце?

Напярэдадні Першай сусветнай вайны ў Беларусі дзейнічалі 34 акцыянерныя прадпрыемствы, палова з якіх утварылася ў 1908–1914 гг. Праз акцыянерны капітал у эканоміку паступалі замежныя інвестыцыі. Напрыклад, бельгійскім акцыянерным таварыствам належалі віцебскі трамвай і льнопрадзільная фабрыка «Дзвіна», французы валодалі шоўкапрадзільнымі фабрыкамі ў Мінску, нямецкі капітал заўважны быў у дрэваапрацоўцы.

Як вы лічыце, чаму замежнікі ўкладвалі грошы ў эканоміку Беларусі?

**Манапалістычныя аб'яднанні**

Напачатку XX ст. у прамысловай вытворчасці Беларусі з'явіліся *манапалістычныя аб'яднанні (сіндыкаты)* — аб'яднанні прадпрыемстваў з мэтай прадухілення канкурэнцыі і паляпшэння ўмоў дзейнасці ў галіне вызначэння цэн, закупкі сыравіны, збыту прадукцыі; пры гэтым члены сіндыката захоўваюць вытворчую і юрыдычную самастойнасць. У 1905 г. у Копысі быў створаны сіндыкат кафляных заводчыкаў, у 1906 г. у Оршы — сіндыкат піваварных заводчыкаў Паўночна-Заходняга краю, у 1911 г. — сіндыкат *«Прадакон»*, які кантраляваў вытворчасць канвертавых фабрык Брэста, Вільні і Адэсы, у 1905 г. у Мінску арганізацыйна аформіўся *«Камітэт запалкавых фабрыкантаў Заходняга краю»*. Часцяком мясцовыя прадпрымальнікі рабіліся ініцыятарамі

стварэння агульнарасійскіх манапалістычных аб'яднанняў.

**Развіццё транспартнай сістэмы**

**4. Развіццё транспарту і гандлю.** На працягу XIX — пачатку XX ст. на тэрыторыі Беларусі былі значна ўдасканаленыя водныя шляхі, шасэйныя і грунтовыя дарогі. Да пачатку чыгуначнага будаўніцтва яны былі асноўнымі транспартнымі артэрыямі Беларусі, дазвалялі весці транзітны гандаль з суседнімі рэгіёнамі. Асаблівае значэнне мелі *Пецярбургска-Кіеўская* і *Маскоўска-Варшаўская шасэйныя дарогі*. Водныя шляхі стваралі рэкі басейнаў Дняпра, Заходняй Дзвіны і Нёмана, якія *Днепра-Бугскім*, *Агінскім* і *Бярэзінскім каналамі* злучаліся ў адзіную транспартную сістэму. У рачным суднаходстве за другую палову XIX ст. значна вырасла роля параходаў.

**Чыгуначнае будаўніцтва**

На эвалюцыю гарадскіх паселішчаў, далейшае развіццё гандлю і прамысловасці Беларусі істотны ўплыў аказала чыгуначнае будаўніцтва. Да 80-х гг. XIX ст. чыгункі будавалі прыватныя акцыянерныя таварыствы з удзелам замежнага капіталу. Пасля рэарганізацыі сістэмы чыгуначнага транспарту Расійскай імперыі ўсе асноўныя магістралі Беларусі зрабіліся дзяржаўнымі.

У выніку чыгуначнага будаўніцтва значнымі цэнтрамі транзітнага гандлю зрабіліся гарады Мінск, Гомель, Орша, Пінск і інш. Беларусь атрымала больш шчыльную сувязь паміж уласнымі рэгіёнамі, а таксама з найважнейшымі індустрыяльнымі раёнамі Расійскай імперыі.

Як вы лічыце, чым была абумоўлена вялікая шчыльнасць чыгунак у Беларусі?

У 1913 г. Беларусь працягласцю чыгунак на адзінку плошчы тэрыторыі ў 1,8 раза пераўзыходзіла аналагічныя паказчыкі па еўрапейскай частцы Расійскай імперыі.

**Развіццё гандлю**

У другой палове XIX ст. кірмашы страцілі сваю ранейшую ролю ў развіцці гандлю. Замест гэтага пачалі пашырацца магазіны і крамы. Га-

лоўным таварам на беларускім рынку ў гэты час быў лес. Другое месца ў тавараэвароце займала




*Схема чыгуначных шляхоў у другой палове XIX — пачатку XX ст.*

Разгледзьце чыгуначную сетку Беларусі. Якія чыгункі і ў якім гаду былі пабудаваныя? Праз якія беларускія гарады яны праходзілі? Як змянілася роля гэтых гарадоў пасля будаўніцтва чыгункі?

Як вы лічыце, чаму ў другой палове XIX ст. павялічылася роля ў развіцці гандлю магазінаў і крам? З чым гэта звязана?



*Крамны гандаль у Пінску. Канец XIX ст.*

група тавараў паляводства (збожжавыя, садавіна, агародніна і інш.), аднак іх удзельная вага паступова скарачалася, асабліва ў сувязі з пераарыентацыяй сельскай гаспадаркі на мяса-малочную вытворчасць. Гэта прывяло да росту ў таваразвароце беларускіх губерняў удзельнай вагі прадуктаў жывёлагадоўлі.

Прадукты сельскай гаспадаркі і прамысловыя вырабы з Беларусі вывозіліся ў гарады еўрапейскай часткі Расійскай імперыі, прывісленскія губерні. Прадпрымальнікі беларускіх губерняў найбольш актыўныя гандлёвыя сувязі мелі з Германіяй. Гандаль у Беларусі прыносіў большы прыбытак у параўнанні з прамысловасцю. Даходнасць яго была вышэйшая, чым у сярэднім па Расійскай імперыі. У сувязі з паляпшэннем шляхоў зносін вываз сыравіны з тэрыторыі Беларусі прыносіў большы даход, чым яе апрацоўка на месцы.

### Фарміраванне ўнутранага рынку Беларусі

Напачатку XX ст. завяршаецца фарміраванне ўнутранага рынку. Праз Беларусь ажыццяўляліся гандлёвыя сувязі Расійскай імперыі з заходнімі

## Гісторыя і сучаснасць

Рэспубліка Беларусь ажыццяўляе шматвектарную знешнюю палітыку і падтрымлівае гандлёвыя зносіны з 200 краінамі свету. Экспарт з'яўляецца адным з прыярытэтаў развіцця беларускай эканомікі. Таварная структура экспарту ўключае ў сябе больш за тысячу таварных пазіцый, найважнейшыя сярод якіх — прадукцыя нафтахіміі, машынабудаўніцтва, металургіі, дрэваапрацоўкі, лёгкай прамысловасці, малочная і мясная прадукцыя, мэбля, шкло, шкловалакно, цэмент.

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, вызначыце, як змянілася геаграфія знешняга гандлю ў параўнанні з XIX ст.*
2. *Параўнайце тавары, якія экспартаваліся ў XIX ст., з галоўнымі экспартнымі таварамі Рэспублікі Беларусь. Вызначце, у які перыяд пераважаў экспарт прадукцыі, а ў які — сыравіны.*
3. *Як вы лічыце, які від экспартных тавараў у большай меры адпавядае нацыянальным інтарэсам Беларусі — сыравіна ці гатовая прадукцыя? Сваю думку растлумачце.*

дзяржавамі. Павелічэнню таварнага абарачэння і развіццю гандлю спрыяла дзейнасць розных гандлёвых аб'яднанняў, крэдытных устаноў, банкаў і ашчадных кас.

У 80-я гг. XIX ст. у Беларусі ўжо працавалі аддзяленні Дзяржаўнага, Сялянскага пазямельнага, Дваранскага банкаў, Мінскі камерцыйны, Віцебскі губернскі і іншыя банкі. У гэты час пашырылася гандлёвае прадпрымальніцтва, сфарміраваўся клас прадпрымальнікаў.

Колькасць буржуазіі расла за кошт прадстаўнікоў розных саслоўяў, перш за ўсё дваранства і купецтва, а таксама мяшчан, ганаровых грамадзян і інш.

**Колькасць гарадскога насельніцтва**

**4. Урбанізацыя.** Колькасць гарадскога насельніцтва Беларусі павялічвалася нязначнымі тэмпамі. Удзельная вага гараджан напярэдадні Першай сусветнай вайны складала каля 11 %. Гэта крыху ніжэй за сярэдні паказчык па еўрапейскай частцы Расійскай імперыі — 14,4 %.



*Мінск у пачатку XX ст.*

Разгледзьце фотаздымак горада Мінска ў пачатку XX ст. Якія адрозненні ад сучаснага горада вы заўважылі?

Рост гарадоў стрымлівалі асаблівасці тэрытарыяльнага размяшчэння і спецыялізацыі мясцовай прамысловасці, канцэнтрацыя фабрык і заводаў у сельскай мясцовасці. Нязначная патрэба гарадской прамысловасці ў наёмнай рабочай сіле шмат у чым вызначыла адсутнасць тут буйны́х гарадскіх цэнтраў. Напрыканцы XIX ст. ад 50 да 100 тыс. жыхароў налічвалася толькі ў Мінску і Віцебску. Адмоўна ўплывалі і ўрадавыя мерапрыемствы, скіраваныя на штучнае стрымліванне надання буйны́м населеным пунктам статусу горада.

Якая асаблівасць этнічнага складу насельніцтва беларускіх гарадоў была абумоўлена палітыкай расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі?

**Перадумовы фарміравання нацыянальнага рынку**

**6. Фарміраванне нацыянальнага рынку.** У другой палове XIX — пачатку XX ст. у Беларусі адбывалася паступовае фарміраванне нацыянальнага рынку, якое суправаджалася пераходам ад мануфактурнай да фабрычнай вытворчасці, развіццём спецыялізацыі сельскай гаспадаркі і ростам таварна-грашовых адносін. Новыя шляхі зносін і сродкі сувязі спрыялі зліццю мясцовых рынкаў Беларусі ў адзіны нацыянальны рынак. Дзякуючы гэтаму значна ўзмацніліся сувязі беларускага рынку з агульнарасійскім і еўрапейскім. На гэтых рынках выяўлялася канкурэнтаздольнасць тавараў і вызначалася спецыялізацыя сельскай гаспадаркі і прамысловасці Беларусі.

**Прамысловасць**

Прамысловасць Беларусі была пераважна арыентаваная на перапрацоўку лясной, сельскагаспадарчай і мінеральнай сыравіны. Найбольш развітымі галінамі прамысловасці былі харчовая, дрэваапрацоўчая, гарбарная і сілікатна-цагляная.

**Сельская гаспадарка**

У другой палове XIX ст. пачала развівацца спецыялізаваная сельская гаспадарка. У Гродненскай, Віленскай і Мінскай губернях гаспадаркі пераходзілі на гадоўлю высокапрадукцыйных парод кароў і вытворчасць сыру і масла. Важнымі галінамі зрабіліся таксама свінагадоўля, льнаводства (у Віцеб-

скай і Віленскай губернях) і вырошчванне канапель (на Магілёўшчыне).

**Шматукладнасць прамысловай вытворчасці**

**7. Вынікі прамысловага развіцця.** Развіццё прамысловасці Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст. не прывяло да кардынальных змен у яе структуры. Рамяство і мануфактура ў Беларусі, нягледзячы на тое што паступова саступалі паказчыкам роста фабрык і заводаў, тым не менш працягвалі павялічвацца і займалі сваю эканамічную нішу.

Індустрыяльнае развіццё Беларусі ў гэты перыяд ішло ў адпаведнасці з уласнымі патрэбамі рэгіёна і засноўвалася на традыцыйнай структуры яго эканомікі. Паралельнае існаванне рамесніцкіх майстэрняў, мануфактур і фабрык не было сведчаннем адсталасці прамысловага развіцця Беларусі. Яно было абумоўлена арыентацыяй на выкарыстанне пераважна сельскагаспадарчай сыравіны, перапрацоўка якой не патрабавала стварэння буйных прамысловых вытворчасцей, а таксама структурай мясцовых працоўных рэсурсаў, наяўнасцю вялікай колькасці таннай рабочай сілы. З мэтай перапрацоўкі лясной і сельскагаспадарчай сыравіны нават для ўладальнікаў значных капіталаў было больш рэнтабельна ствараць параўнаўча невялікія вытворчасці, дзе эканомія на транспартных расходах і заработнай плаце перавышала перавагі, якія давала буйная вытворчасць у параўнанні з дробнай.

**Тэмпы прамысловага росту**

На працягу першых двух дзесяцігоддзяў пасля рэформы 1861 г. прамысловы рост у Беларусі быў запаволеным. 80-я гг. XIX ст. былі досыць складаным і неспрыяльным перыядам у эканамічным развіцці. Працэс фарміравання прамысловай вытворчасці ў беларускіх губернях значна паскорыўся ў 1890-я гг. За апошняе дзесяцігоддзе XIX ст. сярэднегадавы прырост вытворчасці прамысловай

прадукцыі склаў 8,2 %, што ў 2 разы вышэй, чым у папярэднія дзесяцігоддзі. Прамысловы пераварот у Беларусі завяршыўся ў асноўным да 1900 г., на дзесяцігоддзе пазней, чым у Расійскай імперыі ў цэлым. Беларусь напачатку XX ст. адрознівалі вышэйшыя тэмпы прамысловага развіцця, чым у сярэднім па Расійскай імперыі. Апроч таго, прасочваецца тэндэнцыя пашырэння перапрацоўкі сыравіны, якая раней пастаўлялася на продаж у неапрацаваным выглядзе, актывізавалася развіццё дрэваапрацоўкі.

**Асаблівасці фарміравання прадпрымальніцкага асяроддзя**

**8. Прыватнае прадпрымальніцтва.** Адметнай асаблівасцю фарміравання прадпрымальніцкага асяроддзя ў Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст. з'яўляецца яе эвалюцыя з групы пераважна саслоўнай, звязанай з прыналежнасцю да купецтва або мяшчанства, у групу галоўным чынам сацыяльна-прафесійную, для якой былі характэрныя мэтанакіраваная прадпрымальніцкая дзейнасць, арыентаваная на атрыманне прыбытку, уласная сістэма каштоўнасцей, этыка і культура дзелавых адносін.

Прадпрымальнікі заходніх рэгіёнаў Расійскай імперыі, у тым ліку беларускіх губерняў, вылучаліся вядучай роляй дваранства сярод уладальнікаў прамысловых прадпрыемстваў. Адметнасцю дваранскага прамысловага прадпрымальніцтва выступала тое, што прадстаўнікі вышэйшага саслоўя былі адначасова і гаспадарамі прадпрыемстваў, і ўладальнікамі сыравіны, якую яны выкарыстоўвалі. Беларускія губерні характарызаваліся адносна слабым удзелам сялянства ў прамысловым прадпрымальніцтве. Напачатку XX ст. адбыўся значны рост долі мяшчан сярод уладальнікаў прамысловых прадпрыемстваў у беларускіх губернях. Мяшчанам належалі пераважна дробныя прадпрыемствы.

### Гандлевая буржуазія

У Беларусі гандлёвая буржуазія перасягала прамысловую велічынёй капіталаў. Купцы і мяшчане паступова выцяснялі з прамысловага прадпрымальніцтва дваран, якія напачатку XX ст. саступілі ім свае вядучыя пазіцыі. Ва ўласнасці купцоў і мяшчан знаходзілася тытунёвая вытворчасць у Беларусі, 89 % перапрацоўкі льну, 84 % тыпаграфій і слясарных майстэрняў, 73 % запалкавых прадпрыемстваў.

*У Беларусі на працягу другой паловы XIX — пачатку XX ст. адбываліся змены, якія сведчылі пра станаўленне індустрыяльнага грамадства. Аднак гэты працэс адбываўся нераўнамерна, па-рознаму пранікаў у розныя сферы жыцця. Прамысловы пераварот завяршыўся да пачатку XX ст., але пры гэтым захоўвалася высокая доля дробнай вытворчасці. Большасць прамысловых прадпрыемстваў працавалі ў сельскай мясцовасці. Гарадское насельніцтва расло павольней, чым у іншых рэгіёнах еўрапейскай часткі Расійскай імперыі.*

| калі ў свеце... | на тэрыторыі Беларусі... |
| --- | --- |
| 1872 г. — адкрыта першая чыгунка ў Японіі | 1862 г. — адкрыта першая чыгуначная лінія (участак Парэчча — Гродна) |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Складзіце тэзісны план адказу на пытанне «Асаблівасці прамысловага перавароту ў Беларусі».
2. Вылучыце адметнасці станаўлення капіталістычных адносін у Беларусі. Дакажыце, што развіццё капіталістычных адносін на тэрыторыі Беларусі адбывалася нераўнамерна.
3. Ахарактарызуйце працэс развіцця мануфактурнай і фабрычна-заводскай вытворчасці ў Беларусі ў XIX — пачатку XX ст.
4. Вызначыце ролю чыгуначнага транспарту ў развіцці эканомікі беларускіх губерняў у XIX — пачатку XX ст.
5. Складзіце схему, якая адлюструе кірункі ўнутранага і знешняга гандлю Беларусі ў XIX — пачатку XX ст., прадметы гандлю.
6. Чаму ў Беларусі гарадское насельніцтва расло павольней, чым у іншых гарадах еўрапейскай часткі Расійскай імперыі?
7. Вылучыце перадумовы фарміравання беларускага нацыянальнага рынку. Як гэты працэс праявіўся ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы?
8. Ахарактарызуйце вынікі прамысловага развіцця беларускіх губерняў у другой палове XIX — пачатку XX ст.
9. Вызначыце асаблівасці фарміравання прадпрымальніцкага асяродку ў Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст.